Ігуменскі тракт
№ 17 (163)



■ Без межаў

# Дух міратворства пад небам Італіі

## Беларускія іконы прадстаўлены ў Ватыкане



Ікона «Апостал Андрэй і Апостал Павел» сімвалізуе яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў.

**У Музеі Ватыкана адкрылася выстава беларускага іканапісу. Творы XVII—XXI стагоддзяў прывезены туды з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Айчынная экспазіцыя атрымала шмат станоўчых водгукаў прадстаўнікоў замежных сродкаў масавай інфармацыі, іншых гасцей, якія спецыяльна прыходзілі, каб паглядзець на беларускія святыні. Падчас афіцыйнага візіту ў Ватыкан выставу наведаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў суправаджэнні Дзяржаўнага сакратара Папы Францыска кардынала П'етра Параліна.**





Фота БЕЛТА.

Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Уладзімір ПРАКАПЦОЎ і Фёдар ПОЎНЫ.

У экспазіцыі прадстаўлены 31 абраз беларускіх іканапісцаў і 2 чаканныя аправы абразоў. Дэманструюцца яны ў зале № 19 знакамітай Пінакатэкі з грэчаскім іканастасам — у непасрэднай блізкасці ад вядомай Сікстынскай капэлы з роспісамі Мікеланджэла.

**Загадчык аддзела старажытнабеларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Алена КАРПЕНКА** адзначае, што на выставе прадстаўлены абразы перыяду фарміравання нацыянальнай школы іканапісу ў часы пад'ёму нацыянальнай культуры ва ўсіх яе праявах. Тады беларускія майстры асвойвалі перадавыя заходнееўрапейскія стылі, складаную арнаментыку і сімволіку барока, а пасля — ракако. У экспазіцыі пра гэта сведчаць тры абразы Маці Божай і 12 твораў са святочнага рада іканастаса царквы вёскі Аброва Івацэвіцкага раёна на Брэстчыне. Некаторыя абразы Маці Божай — як знакамітая Жыровіцкая або прадстаўленая на выставе Маці Божая Барунская з Ашмянскага раёна — шануюцца каталіцкай і праваслаўнай канфесіямі.

Варта адзначыць, што на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным мастацкім музеі, якая ладзілася з нагоды адкрыцця выставы ў Ватыкане, прысутнічалі праваслаўны і каталіцкі святары (гэтаксама як і на адкрыцці ў Ватыкане).

— Наша зямля знаходзіцца на скрыжаванні розных шляхоў. Тут здаўна суіснавалі розныя канфесіі і рэлігіі, — адзначыў **архіепіскап-мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ**. — Ёсць шмат змешаных сем'яў, дзе людзі прытрымліваюцца рознага веравызнання: адзначаюць і праваслаўныя, і каталіцкія святы — і гэта таксама добра. У Беларусі існуе міжканфесійны мір, а гэта дарагога каштуе ў сённяшнім свеце. Мы маем тое, чым можам падзяліцца з суседзямі. Каб у Еўропе дэмакратычных каштоўнасцяў з'явілася яшчэ і Еўропа Духу.

Беларусь — бадай адзіная краіна, дзе настолькі шчыльна, на роўных правах, у згодзе паміж сабою суіснуюць розныя канфесіі.

— Не ўсе праваслаўныя ўхвалілі нашу паездку ў Ватыкан, — адзначыў **протаіерэй, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода горада Мінска Фёдар ПОЎНЫ**. — Аднак мы зрабілі гэта, паказалі свету нашу традыцыю, духоўнае жыццё, прыадчынілі душу народа. І прадэманстравалі, наколькі мудра мы можам захоўваць дух міратворства і паказваць яго людзям. Мы яшчэ раз паказалі, што Беларусь з'яўляецца той міратворчай «падушкай», якая абодвум бакам дапамагае захоўваць стабільнасць і ў той жа час адчуваць сябе спакойна.

Акрамя старажытных ікон, на выставе ў Ватыкане прадстаўлены дзве сучасныя работы — мінскіх іканапісцаў Паўла і Андрэя Жаравых. Гэта абразы «Святыя Казьма і Даміян Рымскія» і «Успенне Маці Божай». Экспазіцыю традыцыйнай беларускай іконы вырашана было дапоўніць сучаснымі работамі, каб падкрэсліць пераемнасць, багатыя традыцыі ў іканапіснай школе, што дайшлі да сучаснасці.

Беларуская выстава ў Ватыкане не будзе мець свой працяг у Мінску. У каталіцкай сталіцы свету яна будзе экспанавацца да 25 ліпеня. А 27-28 верасня дапоўненая экспазіцыя іканапісу адкрыецца ў Мінску, пра што паведаміў **дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ**. Акрамя каталіцкіх і праваслаўных абразоў, публіцы будуць прадстаўлены алтарны жывапіс, літургічныя прадметы, тканцтва, калекцыя марак на рэлігійную тэматыку. Да выставы будуць прымеркаваны інтэрактыўныя мерапрыемствы для дзяцей і дарослых, «круглы стол» і іншыя.

Дасягнута дамоўленасць аб тым, што некалькі беларускіх рэстаўратараў накіруюцца ў Ватыкан засвойваць сакрэты рэстаўрацыйнай справы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

---

**Чым прыцягваюць да сябе вырабы вясковых майстроў далёкага мінулага — сатканыя, вышываныя, сплеценыя са звычайнага матэрыялу, на які заўжды была шчодрай наша прырода? Іх простую прыгажосць не зацямняць час, не заменяць модныя творы сённяшніх мадэльераў.**



Гэтаму ручніку каля 140 гадоў.

# УЗОРЫ ДАЎНІНЫ ДАЛЁКАЙ



Вышыванкі, створаныя школьніцамі, паказваюць Насця САСУНОЎСКАЯ і Таня АБРАМОВІЧ.

Узоры стогадовай даўніны можна ўбачыць на незвычайнай экспазіцыі ў адным з пакояў сельскага Дома культуры вёскі Мётча Барысаўскага раёна. Аматары народнага мастацтва і рамёстваў сабралі тут багатую этнаграфічную калекцыю. Тканая пакрыўка на дзяжу, стракатыя ходнікі, кошыкі і абутак з лазы, маслабойка, васковае адзенне, мноства абрусаў і ручнікоў — не пералічыць усіх «рарытэтаў» сельскага музея. Першынство па ўзросце належыць вышыванаму ручніку, які перадала сям'я Цішкайцоў — яму каля 140 гадоў.

Творы сапраўдных майстроў заўжды пабуджаюць да працы новых пераймальнікаў. Спадчыннае майстэрства вышывальшчыц далёкіх часоў натхняе мясцовых школьніц, аўтараў цудоўных вырабаў, аздобленых традыцыйным арнаментам.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

---

■ Шануй сваё

# ВАЎНЯНЫЯ САКРЭТЫ

## Унікальнае рамяство шапавалаў

**У музеі народнай архітэктуры і побыту адкрылася выстава «Падняпроўскае шапавальства», якая стала вынікам доўгай рэстаўрацыйнай працы. Цяпер там можна даведацца пра традыцыйнае майстэрства больш падрабязна і пабачыць на свае вочы рэдкія экспанаты.**

Шапавальства як рамяство ўзнікла ў Беларусі ў XVI—XVII стагоддзях. Спачатку як гарадское, паступова пранікала ў сялянскі асяродак, і ў XIX стагоддзі ім займаліся ўжо ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Асноўным было Падняпроўе, а дакладней цяперашні Дрыбінскі раён. Менавіта майстэрства дрыбінскіх шапавалаў увайшло ў Спіс нематэрыяльнай спадчыны Беларусі.

Шапавальства мела два асноўныя кірункі: абыходнае, калі рамеснікі хадзілі па вёсках і працавалі з воўнай, якую набывалі ў сялян, і кустарнае, для якога неабходна была прастора, дзе б шапавал працаваў, захоўваў свае вырабы. Звычайна гэта была хата ці падсобнае памяшканне: паветка, хлеў, лазня і іншае.



Каля валянага пледу — Зоя ТОЎСЦІК.

Прыклад такой майстэрні шапавала паказаны ў помніку архітэктуры «Вяночны двор вёскі Бракава Слабада Чавускага раёна». Асноўная частка знаходзіцца ў двух памяшканнях: адно — паветка для дроў і транспартных сродкаў, другое — для шапавальных станкоў і прылад. Тут воўна качалася, мялася пры дапамозе валікаў, карыта, прылады пад назвай валюшкі. Побач — бязмены для ўзважвання воўны: да 1 кг ішло на выраб мужчынскага валёнка, на жаночы — крыху менш, 800 г.

Найперш прыцягвае ўвагу вялікая воўначасальная машына (шэрстабітная), якая выкарыстоўвалася для расчэсвання воўны, што сама выходзіла з кола, праходзіла ўвесь шлях адбіцця на валіках. І мы можам пабачыць, як асобныя няроўныя, збітыя, кудлатыя кавалачкіператвараюцца ў роўную, мяккую, пушыстую воўну.

Каб надаць правільную форму валёнкам, унутр ставіліся драўляныя калодкі: капыл — на нос, пасля ўбіваліся пярэдняя і задняя правідлы, а паміж імі — кліны для павелічэння халявы. Малаток быў неабходны, каб забіваць кліны, пемза — для таго, каб прыбраць варсінкі.

Перад валеннем воўна расчэсвалася, але не мылася. Яе палівалі гарачай вадой ў працэсе валення. Воўну мылі толькі тады, калі рабілі ваўняныя ніткі.

У музейнай экспазіцыі прадстаўлены прыклады ваўняных вырабаў: валёнкі, світкі паазерскія і падняпроўскія з капюшонамі, але суконныя. На жаль, прадметаў на выставе пакуль мала. Але, будзем спадзявацца, з часам экспазіцыя папаўняцца.

**Святлана ТОЎСЦІК**





Элементы экспазіцыі «Падняпроўскае шапавальства».